ISSN 2524-2369 (Print)
ISSN 2524-2377 (Online)
УДК /61/:/67.7
https://doi.org/10.29235/2524-2369-2024-69-4-278-283

Паступіў у рэдакцыю 29.04.2022
Received 29.04.2022

**А. С. Чарвінскі**

*Інстытут філасофіі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Мінск, Беларусь*

# ДЫЛЕМА ПРЫГОЖАГА І КАРЫСНАГА Ў НАРМАТЫЎНЫМ ВЫЗНАЧЭННІ ЯКАСЦІ НАВАКОЛЬНАГА АСЯРОДДЗЯ

**Аннотация.** Исследованы теоретические основания функционального расширения возможностей комплексной оценки качества окружающей человека природной среды обитания посредством включения в ее структуру эстетических критериев. Дилемма красивого и полезного в природной среде рассматривается в контексте ретроспективного анализа философских подходов к проблеме И. Канта, Сократа, производится концептуальная апелляция к мнению Ч. Дарвина в отношении функций красивого в природе. Анализируется проблема адаптации эстетических критериев к традиционным оценочным системам, обосновывается прикладная состоятельность экологической оценки в том случае, если она базируется на признании функциональной значимости красивого или безобразного в природной среде. Эстетические критерии в комплексной оценке качества окружающей среды выступают как показатель уровня эстетической комфортности условий жизни. Они базируются как на эмоционально-чувственном восприятии природного объекта, так и на рациональном осознании его функционально-прикладной состоятельности. Эмоционально положительная либо эмоционально отрицательная оформленность экологической оценки носит нормативный характер, может быть выражена в баллах, система которых условно отражена в социально-экологическом понятии «эстетическая комфортность». Делается вывод, что такой подход позволит обеспечить функциональную состоятельность критериев и, следовательно, сделать их практически востребованными в процедуре комплексной оценки качества окружающей человека природной среды обитания.

**Ключевые слова:** эстетические критерии в экологической оценке, нормативные показатели, «эстетическая комфортность»

**Для цитирования:** Чарвінскі, А. С. Дылема прыгожага і карыснага ў нарматыўным вызначэнні якасці навакольнага асяроддзя / А. С. Чарвінскі // Вес. Нац. акад. навук Беларусі. Сер. гуманітар. навук. – 2024. – Т. 69, № 4. – С. 278–283. https://doi.org/10.29235/2524-2369-2024-69-4-278-283

**Alexander S. Chervinsky**

*Institute of Philosophy of the National Academy of Sciences of Belarus, Minsk, Belarus*

## NORMATIVE PRINCIPLES IN THE STRUCTURE OF A COMPREHENSIVE ASSESSMENT OF ENVIRONMENTAL QUALITY

**Abstract.** Theoretical foundations for the development of the functional capabilities of a comprehensive assessment of the quality of the natural environment surrounding a person by including aesthetic criteria in its structure are studied. The dilemma of the beautiful and the useful is considered in the context of a retrospective consideration of the approaches to the problem of the philosophers I. Kant, Socrates, a conceptual appeal is made to the opinion of Ch. Darwin regarding the functions of the beautiful in nature. The problem of adapting aesthetic criteria to traditional evaluation systems is analyzed, the applied viability of environmental evaluation is substantiated if it is based on the recognition of the functional significance of beautiful or ugly in the natural environment. Aesthetic criteria in a comprehensive assessment of the quality of the environment act as an indicator of the level of aesthetic comfort of living conditions. They are based both on the emotional and sensory perception of a natural object, and on the rational awareness of its functional and applied viability. Emotionally positive or emotionally negative design of environmental assessment is of a normative nature, can be expressed in points, the system of which can be conditionally reflected in the socio-ecological concept of “aesthetic comfort”. It is concluded that this approach will ensure the functional viability of the criteria, and, therefore, make them practically in demand in the procedure for a comprehensive assessment of the quality of the natural habitat surrounding a person.

**Keywords:** aesthetic criteria in environmental assessment, regulatory indicators, “aesthetic comfort”

**For citation:** Chervinsky A. S. Normative principles in the structure of a comprehensive assessment of environmental quality. *Vestsi Natsyyanal’nai akademii navuk Belarusi. Seryia humanitarnykh navuk = Proceedings of the National Academy of Sciences of Belarus. Humanitarian Series,* 2024, vol. 69, no. 4, pp. 278–283 (in Belarusian). https://doi.org/10.29235/2524-2369-2024-69-4-278-283

**Уводзіны.** Экалагічная ацэнка якасці прыроднага асяроддзя з эстэтычнага пункту гледжання характарызуецца тым, што ў адрозненне ад іншых нарматыўных канструктаў (біягеацэналагічных, медыка-біялагічных, радыеэкалагічных, санітарна-гігіенічных і інш.) грунтуецца не на рацыя-

© Чарвінскі А. С., 2024

нальных, а на эмацыянальна-пачуццёвых прынцыпах і практычна на вызначэнні розніцы паміж эмацыянальна станоўчым і эмацыянальна адмоўным успрыманнем прыроднага аб'екта.

У сувязі з гэтым аўтару ўяўляецца лагічным выказаць меркаванне аб наяўнасці анталагічных падстаў эстэтычнай ацэнкі непасрэдна ў прыродным асяроддзі, а менавіта ў сферы эталагічных паводзінскіх структур, паколькі яшчэ Ч. Дарвін адзначаў наступную асаблівасць: тое, што з'яўляецца прывабным у самой прыродзе (яркі выгляд самца ў шлюбны перыяд, прыгожая кветка і г. д.), эмацыянальна станоўча ацэньваецца і самім чалавекам [1].

Варта адзначыць, што праблема прынцыповай магчымасці дылемы «станоўчае – пачварнае» ў прыродзе з'яўляецца прадметам актыўнай дыскусіі аб перадумовах і канцэптуальных вытоках фарміравання эстэтычных падыходаў да эмацыянальнага ўспрымання чалавекам знешняга свету. На працягу доўгага перыяду даследчыкамі вырашалася пытанне аб тым, ці магчыма ў прынцыпе эстэтычнае ўспрыманне ў прыродным асяроддзі. У залежнасці ад таго, ці прызнавалася прынцыповая магчымасць «станоўчага – пачварнага» ў прыродзе, безадносна да чалавека, навуковец мог быць аднесены або да ліку «прыроднікаў», або да ліку «грамадскіх».

Пры гэтым часта дастатковай падставай для такога азначэння з'яўляўся сам факт пошуку фундаментальных асноў эстэтыкі як сферы і, адначасова, практычнага механізма эмацыянальна-пачуццёвага ўспрымання ў прыродным асяроддзі. Так, айчыннымі даследчыкамі, прадстаўнікамі крыла «грамадскіх» (М. С. Каган, Л. М. Сталовіч, Э. С. Маркарян) [2–4], да ліку «прыроднікаў» быў аднесены беларускі філосаф М. І. Крукоўскі, хоць ён актыўна адмаўляў такую прыналежнасць [5].

Адрозненні і нават пэўны канцэптуальны антаганізм паміж «грамадскімі» і «прыроднікамі» да гэтага часу яшчэ не пераадолены, і таму аўтар гэтага артыкула, не прымяншаючы актуальнасці праблемы першаснасці ў вызначэнні вытокаў эстэтыкі, ставіць наступныя мэты: на аснове існуючых філасофскіх і прыродазнаўчанавуковых падыходаў абгрунтаваць правамернасць уключэння ў структуры комплекснай экалагічнай ацэнкі эстэтычных крытэрыяў; распрацаваць працэдурныя асновы іх інкарпарацыі ў ацэначную структуру сацыяльнай экалогіі; абгрунтаваць апісальную эфектыўнасць канцэпту «эстэтычная камфортнасць» і прапанаваць яго ў якасці нарматыўнага сацыяльна-экалагічнага паняцця.

**Асноўная частка.** У структуры комплекснай ацэнкі якасці прыроднага асяроддзя эстэтычным паказчыкам традыцыйна адводзіцца не самае прыярытэтнае месца. Разам з тым пашырэнне функцыянальных магчымасцей, як і ўзмацненне ацэначнай адэкватнасці эстэтычных крытэрыяў, мае як тэарэтычную значнасць, так і практычную запатрабаванасць. Гэта звязана з неабходнасцю павышэння эмацыянальнага камфорту ўмоў жыццядзейнасці чалавека ў прыродным асяроддзі.

Магчымасць разгорнутай і досыць поўнай экалагічнай ацэнкі рэалізуецца, як правіла, пры наступных умовах: захавання асноўных біягеацэналагічных параметраў існавання прыродных экасістэм; падтрымання асноўных параметраў нармальнай жыццядзейнасці чалавека; адсутнасці экалагічна-крызісных станаў у развіцці сацыяпрыродных адносін.

Відавочна, што значэнне эстэтычных паказчыкаў значна ўзрастае ва ўмовах экалагічнай аптымальнасці сацыяпрыродных адносін, калі ацэначная структура імкнецца да формы паслядоўных крытэрыяў, пры якой розныя аспекты комплекснай ацэнкі (медыцынскія, біялагічныя, сацыяэкалагічныя, эканамічныя, эстэтычныя і г. д.) першапачаткова прызнаюцца ацэначна раўназначнымі.

У сітуацыі ж экалагічнай экстрэмальнасці, перш за ўсё ў посткатастрафічны перыяд, структура комплекснай ацэнкі набывае выяўленую іерархічную форму, для якой характэрны: структурызацыя ацэначных крытэрыяў па прынцыпу цэнтралізаванай іерархіі; прысутнасць крытэрыяў прыярытэтнага ўзроўню (першым чынам медыка-біялагічных) ва ўсіх наступных; пірамідальная форма ўсяго комплексу крытэрыяў у забеспячэнні функцыянальна-мэтавай агульнасці ацэнкі якасці прыроднага асяроддзя.

У гэтых умовах значэнне эстэтычнага аспекту ў сістэме крытэрыяў комплекснай ацэнкі значна зніжаецца.

Для сітуацыі экалагічнай аптымальнасці характэрна вызначаная залежнасць эстэтычных паказчыкаў ад умоў захавання асноўных параметраў устойлівага развіцця сацыяпрыродных адносін, пры якім значэнне эстэтычнай ацэнкі можа ўзрастаць у сувязі з запатрабаваннем у забеспячэнні камфортнага псіхаэмацыянальнага асяроддзя ў форме стварэння і падтрымання рэкрэацыйных зон: нацыянальных паркаў, запаведнікаў, заказнікаў і г. д. У экалагічна экстрэмальнай

сітуацыі адаптацыя эстэтычных крытэрыяў да іншых паказчыкаў, іх структурызацыя па прынцыпу іерархіі ўскладняюцца ў сувязі з адсутнасцю аб’ектыўных, незалежных ад індывідуальнага ўспрымання крытэрыяў ацэнкі якасці навакольнага асяроддзя.

Паколькі ў такой сітуацыі аспектамі ацэнкі выступаюць суб’ектыўныя адчуванні, калі асабістае ўспрыманне стану прыроднага асяроддзя робіцца не толькі прэваліруючым у сістэме ацэнкі, але часта адзіным паказчыкам экалагічнай якаснасці прыроднага комплексу, то ўзнікае пагроза таго, што празмерная суб’ектыўнасць ацэначнай працэдуры можа значна абмежаваць сферу практычнай рэалізацыі эстэтычных крытэрыяў. Гэта ўскладняе супастаўленне з іншымі крытэрыямі (экалагічнымі, эканамічнымі, медыка-гігіенічнымі і г. д.).

Неабходна ўлічваць, што залішняя рацыянальнасць у ацэначнай трактоўцы пачуццёвых успрыманняў заўсёды мае магчымасць памылкі, таму ставіцца зняважліва да спосабаў выяўлення «логікі прыгажосці» падчас эстэтычнай ацэнкі не варта. Досыць прызнаць, што прыярытэт у структуры эстэтычных крытэрыяў належыць, безумоўна, пачуццёва-эмацыянальнай сферы. У гэтым, відавочна, складаецца асноўнае патрабаванне да практычнага выкарыстання ацэнкі якасці навакольнага асяроддзя па эстэтычных паказчыках. Суб’ектывізм у такой працэдуры непазбежны, таму ацэнка якасці навакольнага прыроднага асяроддзя па эстэтычных прынцыпах дагэтуль не мае свайго канцэптуальнага ўвасаблення ў сістэме іерархічнай узаемазалежнасці. Мінімізацыя верагоднасці ацэначнай памылкі ў эстэтычнай адзнацы дагэтуль з’яўляецца адной з важнейшых задач канцэптуальнай інтэрпрэтацыі праблемы комплекснасці ацэначнай якасці навакольнага асяроддзя.

Адзначым, што гэта праблема выступае прыватным аспектам традыцыйнай у гісторыі філасофіі нявырашанасці пытання аб тым, ці ўласцівы ўспрыманні «вельмі прыгожага» і «пачварнага», «прыгожага» і «брыдкага», г. зн. эстэтычна якаснага і эстэтычна няякаснага, безадносна да ўтылітарных запатрабаванняў альбо такая ацэнка ўласціва чалавечаму ўспрыманню ў кантэксце ўсведамлення яго практычнай карыснасці.

Гісторыя філасофіі мае шмат розных тэарэтычных пабудоў, якія вывучаюць гэту праблему, аднак у рамках дадзенага артыкула лагічным уяўляецца абмежавацца спасылкай на аўтарытэт дзвюх гістарычна значных велічынь – Сакрата і Канта – прадстаўнікоў процілеглых падыходаў у разуменні характару ўзаемаадносін эстэтычнага, г. зн. уласна пачуццёвага, і ўтылітарнага зместу ў ацэначным успрыманні.

Катэгарычнасць кантаўскага падыходу характарызуе безапеляцыйнае, з нашага пункту гледжання, сцвярджэнне: «...Кожны павінен пагадзіцца, што меркаванне аб прыгажосці, да якога прымешваецца найменшая цікавасць, вельмі аб’ектыўнае і не з’яўляецца чыстым меркаваннем густу. Таму для таго, каб быць суддзёй у пытаннях густу, нельга ні ў найменшай ступені быць зацікаўленым у існаванні рэчы, і ў гэтым стаўленні трэба быць цалкам абыякавым» [6, с. 205]. Дэклараемае філосафам патрабаванне «быць абыякавым» да факта існавання рэчы выступае ўмовай «чыстага» ўспрымання з’явы, незалежна ад пэўных формаў існавання «рэчы ў сабе». Па сутнасці, гэта ўяўляе аксіяматыку ўласна кантаўскага, г. зн. суб’ектыўна-ідэалістычнага, разумення прыроды пачуццёвага пазнання. Аднааспектнае разуменне прыроды эстэтычнага ўспрымання не дапускае комплекснай ацэначнай інтэрпрэтацыі і ў гэтым сэнсе ўяўляецца метадалагічна малапрадуктыўным у апісанні якасці навакольнага асяроддзя. Такі падыход, безумоўна, пакідае па-за рамкамі ацэначнай інтэрпрэтацыі любую з функцыянальных характарыстык аб’екта, які ацэньваецца, і, такім чынам, робіць прынцыпова немагчымым сістэмны падыход да ацэнкі.

Значна больш метадалагічных патэнцый у плане забеспячэння комплекснасці ацэначнай працэдуры змяшчае сакратаўскі падыход з яго патрабаваннем спалучаць эстэтычны і функцыянальны змест ацэньваемага аб’екта. Вядомае сцвярджэнне Сакрата аб тым, што «...усё добрае і выдатнае да таго, для чаго яно прыстасавана і, наадварот, дрэннае і пачварнае ў адносінах да таго, для чаго яно дрэнна прыстасавана» [7, с. 90], сугучна нашаму разуменню, з аднаго боку, структурнай паўнаты, а з другога – функцыянальнай эфектыўнасці эстэтычнага крытэрыю ў сацыяэкалагічнай ацэнцы якасці прыроднага асяроддзя.

Відавочна, што такі крытэрый павінен грунтавацца як на эмацыянальным успрыманні прыроднага аб’екта, так і на рацыянальным усведамленні яго функцыянальна-прыкладной прыдатнасці. Менавіта такая комплексная структура дазволіць забяспечыць функцыянальную прыдатнасць крытэрыю і, такім чынам, зробіць яго практычна запатрабаваным у ацэначнай працэдуры.

Згодна з этымалагічным патрабаваннем спалучэння эмацыянальна-пачуццёвых і функцыянальна-прыкладных аспектаў, з ацэначным прыярытэтам менавіта эмацыянальнага зместу, у найбольшай ступені адпавядае, на наш погляд, тэрмін «эстэтычная камфортнасць». Такім чынам, адзначым, што эстэтычны крытэрый у комплекснай ацэнцы якасці навакольнага асяроддзя выступае як паказчык узроўню эстэтычнай камфортнасці ўмоў жыцця ў прыродным асяроддзі.

Лагічна падкрэсліць, што такое разуменне крытэрыю сугучна дарвінскаму разуменню эстэтычна прыдатнага альбо, наадварот, непрыдатнага (з пазіцыі чалавечага ўспрымання) у прыродзе. Ч. Дарвін лічыў выпадковым супадзенне чалавечага ўяўлення аб выдатным у прыродным асяроддзі з пазітыўнай рэакцыяй на гэта «выдатнае» прадстаўнікоў як фларыстычнай, так і фаўністычнай складаючай прыродных сістэм. Так, па меркаванні Ч. Дарвіна, прыгажосць матыля, прывабнасць кветкі з'яўляюцца вынікам своеасаблівай вылучанасці з ардынарнага шэрагу ў той жа меры, як і пачварнасць некаторых праяў у жывёльным і раслінным свеце. Такія праявы, як пачварнасць і прыгажосць, якія ацэньваюцца чалавекам па эстэтычных параметрах, маюць, па меркаванні навукоўца, функцыянальную перадумову. Калі сітуацыя, вызначаная чалавекам як праява прыгажосці ў прыродзе, абумоўлена імкненнем да самазахавання якой-небудзь расліны як віду, то і праяўленне «пачварнасці» абумоўлена тымі ж самымі матывамі – запатрабаваннем захавання віду з дапамогай адпужвання драпежніка. Характэрныя словы Ч. Дарвіна аб тым, што «...прыгажосць, паводле нашага паняцця аб ёй, не ўяўляе ўсеагульнай з'явы, дапусціць кожны, хто зірне на некаторых атрутных змей, на некаторых рыб і некаторых пачварных кажаноў, якія ўяўляюць скажонае падабенства з чалавечай асобай. Палавы адбор надаў самыя прыгожыя фарбы, самыя вытанчаныя формы і іншыя ўпрыгожанні самцам, а часам абодвум палам шматлікіх птушак, матылёў і іншых жывёл... Кветкі і плады сталі адрозніваცца яркай афарбоўкай, якая вылучае іх на зеляніне лістоты, дзеля таго, каб кветкі маглі быць лёгка заўважанымі, наведанымі і аплодненымі насякомымі, а насенне рассейвалася б пры дапамозе птушак. Якім чынам здарылася, што шматлікія колеры, гукі і формы даюць асалоду і чалавеку, і найніжэйшым жывёлам, – іншымі словамі, як узнікла пачуццё прыгажосці ў яго найпрасцейшай форме? Мы гэтага не ведаем, як і не ведаем таго, чаму вядомыя пахі і густы сталі прыемнымі» [1, с. 223].

Відавочна, падыход Ч. Дарвіна можа з'яўляцца прыродазнаўчанавуковай асновай канцэптуальнай інтэрпрэтацыі феномена эстэтычнай ацэнкі якасці навакольнага асяроддзя. Прыродныя аб'екты (дрэвы, кусты, лугавыя экасістэмы і інш.) вылучаюцца з прывычных стэрэатыпаў пачуццёвых выяў, уласцівых індывіду, і, відавочна, такая ж арыгінальнасць знаходзіцца ў аснове эстэтычна станоўчага ўспрымання ландшафтных няроўнасцей, якія абумоўліваюць разнастайнасць прасторавых даляглядаў, характэрных для пагорыстай мясцовасці. Усё, што вылучае і адрознівае аб'ект ад штодзённых, традыцыйных формаў, якія ўспрымаюцца як праява ардынарных кампазіцый, мае сур'ёзныя падставы для эстэтычна пазітыўнага ўспрымання і наадварот. Функцыянальная складаючая забяспечвае магчымасць прыкладнога выкарыстання пералічаных уласцівасцей прыроднага асяроддзя для забеспячэння неабходнай эстэтычнай камфортнасці ва ўмовах захавання асноўных біягеацэналагічных, медыка-біялагічных, санітарна-гігіенічных і іншых характарыстык [8, с. 148].

Асноўная цяжкасць фарміравання крытэрыю на аснове спалучэння функцыянальна-прыкладных і эмацыянальна-пачуццёвых аспектаў заключаецца перш за ўсё ў тым, што ў ім пераважае пачуццёвая складаючая, якая змяшчае ў сабе аспекты перажывання ці эмацыянальна станоўчых або эмацыянальна адмоўных момантаў успрымання. У той жа час у паняційным выяўленні, у сістэме біягеацэналагічных, экалога-эканамічных, санітарна-гігіенічных і іншых крытэрыяў аб'ектыўная рэальнасць паўстае ў агрубелым, спрошчаным выглядзе. Прыроднае асяроддзе ў паняційным выяўленні непазбежна паўстае ў выглядзе асобных фрагментаў, урыўкаў, няскончаных абагульненняў. Ні адна нават найбагацейшая паняційная структура не ў стане адлюстраваць у дастатковай паўнаце ўсю сукупнасць сувязяў, адносін і асаблівасцей міжэлементнага і міжузроўневага ўпарадкавання, характэрнага для рэальнага аб'екта. Таму адносіны канцэптуальнай структуры да аб'ектыўнай рэальнасці характарызуюцца ізамарфізмам, калі ў адным або ў некаторым абмежаваным комплексе паняццяў адлюстроўваецца вялікая сукупнасць рэальных элементаў [9, с. 30].

Вызначэнне якасці прыроднага кампанента на падставе крытэрыяў экалагічнай камфортнасці павінна суадносіцца з іншымі ўласцівасцямі прыроднага комплексу: рэкрэацыйнымі, сельскагаспадарчымі, лесагаспадарчымі і г. д. Пры гэтым неабходна канцэптуальная карэляцыя элементаў,

бо ацэнка якасці асяроддзя на практыцы можа ажыццяўляцца толькі комплексна, з улікам усіх або, прынамсі, асноўных аспектаў якаснай пэўнасці экасістэмы. Эмпірычная ацэнка заўсёды дапускае момант суб’ектывізму, паколькі не мае выразных, лагічна абгрунтаваных рацыянальных параметраў сваёй інтэрпрэтацыі, пры якой індывід успрымае пачуццёва-навакольны свет у адпаведнасці са сваёй унутранай схільнасцю, якая ў сваю чаргу засноўваецца на яго ментальных, культурных, псіхаэмацыянальных асаблівасцях. Спроба лагічнай сістэматызацыі эмацыянальных успрыманняў традыцыйна абмяжоўваецца колькасным абагульненнем адзінкавых або індывідуальных комплексаў эмацыянальнага ўспрымання. Таму сучасныя методыкі ацэнкі навакольнага асяроддзя ў сваёй рацыянальнай праяве ўяўляюць сабой спробу падсумоўваць як эмацыянальна станоўчыя моманты ўспрымання прыроднага асяроддзя, так і эмацыянальна адмоўныя.

Для таго, каб забяспечыць сумяшчальнасць эстэтычнай ацэнкі якасці навакольнага асяроддзя з эканамічнай, біягеацэналагічнай, радыеэкалагічнай і іншымі ацэнкамі, у якіх пераважае не эмацыянальны, а рацыянальны аспект, неабходна звесці ўсю сукупнасць эмацыянальных адзнак да рацыянальнай формы, якая можа быць прадстаўлена ў паняційным выражэнні і, такім чынам, адаптавана да ўмоў комплекснай і шматфактарнай ацэнкі. Паводле заключэння А. Ф. Лосева, «...эстэтыка прыроды не можа будавацца на выпадковых уражаннях, асабістых густах і, як усякая навука, мае патрэбу ў лагічных вызначэннях, катэгорыях і прынцыпах» [10, с. 203].

Рашэнню такой задачы служаць розныя спробы «аб’ектывізацыі» эстэтычнай ацэнкі якасці прыроднага асяроддзя. Найбольш удалымі ў гэтых адносінах варта прызнаць варыянты, у якіх рэалізуецца прынцып якасна-колькаснай звязанасці, які дазваляе ўзровень якаснасці прыроднага кампанента выказаць праз колькасную ацэнку комплексу эстэтычна мадальных успрыманняў. Відавочна, што, нават атрымаўшы поўную, досыць разгорнутую экспертную ацэнку якасці прыроднага асяроддзя па паказчыках яе эстэтычнасці, даследчык, тым не менш, пры спробе комплекснай інтэрпрэтацыі непазбежна сутыкаецца з супярэчнасцю, якая імпліцытна змяшчае ў сабе эмацыянальны і паняційна-катэгарыяльны спосабы ўспрымання.

Прынцыпова новым павінен быць падыход да распрацоўкі механізма ацэначнай працэдуры: абгрунтавання новых, адэкватных у сітуацыі, якая склалася, крытэрыяў, фарміравання сістэмы экалагічных нарматываў, што ўлічваюць магчымасць утварэння сінергетычных эфектаў узаеманакладання фактараў, абгрунтавання ацэначных прынцыпаў, якія адлюстроўваюць іерархічную залежнасць якасных характарыстык прыродных працэсаў. У прыкладным плане гэта задача можа рэалізавацца шляхам увядзення «мяккіх», рухомых крытэрыяў, здольных да адаптацыі да экалагічных умоў, якія змяняюцца ў сувязі з магчымым абвастрэннем або, наадварот, згладжваннем сацыяпрыродных супярэчнасцей ва ўмовах экалагічнага крызісу.

Функцыянальна такая аперацыя можа быць эфектыўна ажыццёўлена з дапамогай якасна-колькаснай інтэрпрэтацыі, у якой комплекс эмацыянальных успрыманняў якасных характарыстык прыроднага ландшафту падвяргаецца колькасным абагульненням. Наступнае колькаснае супастаўленне эстэтычна станоўчых і эстэтычна адмоўных успрыманняў дазваляе, з пэўнай ступенню дакладнасці, вызначаць якасную грунтоўнасць прыроднага комплексу, што, у канчатковым выніку, будзе карысным пры распрацоўцы экалагічнай палітыкі ў рэгіёне. Галоўнай калізіяй, якая вызначае ацэнку прыроды на такім ўзроўні, з’яўляецца супярэчнасць паміж тым, у якім выглядзе існуюць жыццёва важныя элементы ў навакольным асяроддзі, і тым, як яны патрэбны чалавеку. Вырашэнне гэтай супярэчнасці выступае ў форме антрапагеннага пераўтварэння прыроднага асяроддзя. Наяўнасць сацыяльнага стымулу прыводзіць да значнага паскарэння ўсяго эвалюцыйнага працэсу, рэзка павялічваючы маштаб біягеннай міграцыі рэчыва і энергіі.

Такі падыход, які вызначыў у якасці перадумовы пераходу на ўзровень сацыяльнага кіравання біясферай развіццё навуковай думкі, падкрэслівае значэнне свядомай мэтазгоднай ацэначнай дзейнасці ў фарміраванні стратэгіі сацыяльнага прыродакарыстання.

Выкананне патрабавання комплекснасці, з уключэннем крытэрыю эстэтычнай камфортнасці, значна павышае дакладнасць ацэнкі якасці навакольнага прыроднага асяроддзя і, такім чынам, пашырае сферу яе практычнай рэалізацыі.

**Высновы.** Такім чынам, можна зрабіць наступныя высновы: 1) у прыродзе прыгожае і, як яе супрацьлегласць, пачварнае – функцыянальныя, практычныя і часта жыццёва значныя. Пры дапамозе своеасаблівай вылучанасці з ардынарнага шэрагу і прыгожае, і пачварнае служаць вызна-

чанай практычнай мэце (адпужванню драпежніка ці, наадварот, прыцягненню ўвагі носьбітаў генетычнага патэнцыялу); 2) у сувязі з гэтым лагічным уяўляецца прызнаць грунтоўнасць экалагічнай ацэнкі якасці прыроднага асяроддзя па эстэтычных падставах у выпадку, калі яна засноўваецца на прызнанні функцыянальнай значнасці прыгожага або пачварнага ў прыродным асяроддзі; 3) эмацыянальна станоўчая або эмацыянальна адмоўная афармленасць экалагічнай ацэнкі мае нарматыўны характар і можа быць прадстаўлена ў балах, сістэма якіх умоўна адлюстравана ў сацыяэкалагічным паняцці «эстэтычная камфортнасць».

Выкананне патрабавання комплекснасці, з уключэннем крытэрыю эстэтычнай камфортнасці, значна павялічвае дакладнасць комплекснай экалагічнай ацэнкі якасці навакольнага прыроднага асяроддзя і, такім чынам, пашырае сферу яе практычнай рэалізацыі.

У прыкладным плане магчымасць ацэнкі якасці прыроднага асяроддзя на эстэтычнай аснове абумоўлена шмат у чым перспектывай развіцця экалагічнага турызму як аднаго з найбольш прыродаахоўных варыянтаў сацыяльнага прыродакарыстання (не звязанага са значнымі зменамі экалагічных сістэм), якія не патрабуюць павелічэння аб'ёму тэхнагеннай нагрузкі на прыроднае асяроддзе і ў той жа час захоўваюць традыцыйныя для беларускага менталітэту экалагічныя каштоўнасці.

## Спіс выкарыстаных крыніц


1. Дарвин, Ч. Насколько верен утилитарный принцип: как приобретается красота // Происхождение видов / Ч. Дарвин. – М., 1952. – С. 222–225.
2. Каган, М. С. Искусствознание и художественная критика / М. С. Каган // Избр. ст. – СПб.: Мир, 2000. – С. 168.
3. Столович, Л. М. Философия красоты / Л. М. Столович. – М.: Политиздат, 1978. – 118 с.
4. Маркарян, Э. С. Принципы системного исследования культуры (опыт культурологического анализа науки) / Э. С. Маркарян // Диалектика и системный анализ / отв. ред. Д. М. Гвишиани. – М., 1986. – С. 71–80.
5. Крюковский, Н. И. Homo pulcher. Человек прекрасный: очерк теоретической эстетики человека / Н. И. Крюковский. – Минск: Изд-во БГУ, 1983. – 303 с.
6. Кант, И. Сочинения: в 6 т.: [пер. с нем.] / И. Кант. – М.: Наука, 1963–1966. – Т. 5. – 1966. – 564 с.
7. История эстетики: в 5 т. / Акад. художеств СССР, Науч.-исслед. ин-т теории и истории изобразит. искусств. – М.: Мысль, 1962–1970. – Т. 1: Античность. Средние века. Возрождение. – 1962. – 682 с. – (Памятники мировой эстетической мысли).
8. Вернадский, В. И. Биосфера: избр. тр. по биогеохимии / В. И. Вернадский. – М.: Мысль, 1967. – 376 с.
9. Фролова, М. Ю. Оценка эстетических достоинств природных ландшафтов / М. Ю. Фролова // Вестн. Моск. ун-та. Сер. 5, География. – 1994. – № 2. – С. 27–33.
10. Лосев, А. Ф. Эстетика природы (природа и ее стилевые функции у Р. Роллана) / А. Ф. Лосев, М. А. Тахо-Годи. – Киев: Collegium, 1998. – 242 с.


## References


1. Darwin C. Utilitarian doctrine, how far true: beauty, how acquired. *On the origin of species.* Moscow, 1952, pp. 222–225 (in Russian).
2. Kagan M. S. *Art history and art criticism: selected articles.* St. Petersburg, Mir Publ., 2000. 527 p. (in Russian).
3. Stolovich L. M. *Philosophy of beauty.* Moscow, Politizdat Publ., 1978. 118 p. (in Russian).
4. Markaryan E. S. Principles of a systemic study of culture (the experience of cultural analysis of science). *Dialectics and system analysis.* Moscow, 1986, pp. 71–80 (in Russian).
5. Kryukovskii N. I. *Homo pulcher. Beautiful man: essay on the theoretical aesthetics of man.* Minsk, Publishing house of BSU, 1983. 303 p. (in Russian).
6. Kant I. *Essay: in 6 vol. Vol. 5.* Moscow, Nauka Publ., 1966. 564 p. (in Russian).
7. *History of aesthetics. Vol. 1. Antiquity. Middle Ages. Renaissance*. Moscow, Mysl' Publ., 1962. 682 p. (in Russian).
8. Vernadskii V. I. *Biosphere: selected works on biogeochemistry.* Moscow, Mysl' Publ., 1967. 376 p. (in Russian).
9. Frolova M. Yu. Evaluation of the aesthetic merits of natural landscapes. *Vestnik Moskovskogo universoteta. Seriya 5, Geographiya* [Bulletin of Moscow State University. Series 5. Geography], 1994, no. 2, pp. 27–33 (in Russian).
10. Losev A. F., Takho-Godi M. A. *Aesthetics of nature (nature and its stylistic functions in R. Rolland).* Kyiv, Collegium Publ., 1998. 242 p. (in Russian).


## Информация об авторе

**Червинский Александр Сергеевич** – кандидат философских наук, старший научный сотрудник отдела социальной экологии и биоэтики. Институт философии, Национальная академия наук Беларуси (ул. Сурганова, 1, корп. 2, 220072, Минск, Республика Беларусь). E-mail: a.chervinski@gmail.com

## Information about the author

**Alexander S. Chervinsky** – Ph. D. (Philos.), Senior Researcher of the Department of Social Ecology and Bioethics. Institute of Philosophy of the National Academy of Sciences of Belarus (1 Surganov Str., Bldg 2, Minsk 220072, Belarus). E-mail: a.chervinski@gmail.com